**Назва музея:** “Гісторыя асветы г.Оршы і гімназіі №2”
**Назва ўстановы адукацыі**: Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гімназія № 2 г.Оршы”
**Адрас музея**: Віцебская вобласць, г.Орша, вул.Уладзіміра Леніна, д.41, пакой 34.
**Профіль музея**: гістарычны (агульнагістарычны)
**Сайт музея**: няма
**Старонка музея на сайце ўстановы адукацыі**:
https://gimn2.goroo-orsha.by/воспитательная-работа/духовно-нравственное-воспитание-волонтерская-деятельность/виртуальная-экскурсия-по-музею-гимназии
**Старонка ў сацыяльных сетках**: няма
**Інфармацыя аб музеі**:
Музей быў адкрыты пасля капітальнага рамонту будынка 31.08.2008. Кіраўнік музея – Мядзведзева Галіна Святаславаўна. Музей складаецца з двух залаў. Першы зал раскрывае гісторыю адукацыі ў г.Орша з XVI па XXI ст. У экспазіцыі прадстаўлены: стэнды з фотаздымкамі навучальных устаноў сучаснага горада, фотаздымкі манастыроў, копіі і арыгіналы пасведчанняў аб адукацыі. Прадметны рад складаецца з прадметаў, якія маюць дачыненне да адукацыі: парта вучнёўская, некалькі чарніліц, лічыльнікі і інш. Другая зала музея прысвечана гісторыі гімназіі №2, пачынаючы з 1906 года. У музеі для навучэнцаў праводзяцца аглядныя экскурсіі па залах музея, гульні па станцыях з QR – кодамі па музеі, падрыхтаваны тэматычныя экскурсіі: “Як вучыліся нашы продкі”, “Знакамітыя выпускнікі”, “Орша ў гады Вялікай Айчыннай вайны”, “Педагагічныя дынастыі” і інш.
**Кароткая характарыстыка музейных фондаў**: асноўны фонд – 314, які ўключае: вучэбнікі, вучэбныя дапаможнікі, школьные прылады, якія выкарыстоўваліся ў навучальным працэсе, школьная і піянерская формы, парта вучнёўская. Дапаможны фонд – 423, які ўключае фотаздымкі, копіі дакументаў, граматы, дыпломы, газеты і інш.
**Найбольш каштоўныя музейныя прадметы**: чарнільніца “Віцязь” – пач.XX ст./2017, пенал вучнёўскі – 1980/2017, прэс-пап’е – 1950/2017, чарніліца з пяром – 1972/2017.
**12. Апісанне экспазіцый**:

Зала №1:

1. “Сярэднія і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы г.Оршы”. У экспазіцыі на стэндах размешчаны фотаздымкі навучальных устаноў горада XX стагоддзя.
2. “Навучальныя ўстановы г.Оршы XVI-XIX стагоддзяў”. У экспазіцыі на стэндах размешчаны фотаздымкі памяшканняў, дзе размяшчаліся навучальныя установы горада XVI-XIX стагоддзяў. У экспазіцыі змешчаны вітрыны з музейнымі прадметамі, якімі карысталіся вучні таго часу.

Зала №2

1. “Рэальнае вучылішча: гісторыя і архітэктура”. У экспазіцыі прадстаўлен стенд “Першы выпуск рэальнага вучылішча”, на якім размешчаны фотаздымкі рэальнага вучылішча і навучэнцаў яго першага выпуску.
2. “Настаўнікі і вучні школы – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны”. У экспазіцыі на стэндах размешчаны фотаздымкі педагогаў і вучняў, якія прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне і інфармацыя аб некаторых з іх.
3. “Наша школа: 1945-2005 гг.” На экспазіцыйным стэндзе размешчана інфармацыя аб дзейнасці гімназіі ў паслеваенный перыяд.
4. “Гімназія сёння”. У экспазіцыі раздзела прадстаўлена інфармацыя аб сучаснай гісторыі гімназіі.
5. “Нашы кіраўнікі”. У экспазіцыі раздзела маюцца фотаздымкі кіраўнікоў вучэбнай установы, даследчыя работы вучняў аб педагагічных дынасціях педагогаў гімназіі.
6. “Нашы выпускнікі”. У экспазіцыі раздзела прадстаўлена інфармацыя аб вядомых выпускінках гімназіі: М. Волкаў, С.Дарашэвіч, В.Грамыка і інш.

**Узнагароды музея.**

Рэспубліканскі конкурс юных экскурсаводаў, рэспубліканская акцыя “Я гэты край Радзімаю заву”, намінацыя “Скарбонка часу”, 2023 год – Дыплом лаурэата (вучань 11 кл. Гусакоў Максім).

**Фотаздымкі музея:**

https://drive.google.com/drive/folders/1MbyqrHdAwNZx21vYG8MEMyIqdWICtGQm?usp=sharing

**Дадатковыя матэрыялы:**

Відеаролік: «Приглашаем в Музей истории просвещения г.Орши ГУО «Гимназия №2 г.Орши»

https://youtu.be/kX4hCwYSf9s